ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 3 (1039) ● ЧАЦВЕР, 24 студзеня 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

## ПАМНОЖЫМ ПОСПЕХІ

З вялікім уздымам і глыбокай зацікаўленасцю ўспрынялі савецкія людзі рашэнні снежаньскага Пленума ЦК КПСС, Зварот Цэнтральнага Камітэта КПСС да партыі, да савецкага народа, пастанову Цэнтральнага Камітэта КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб усесаюзным спаборніцтве работнікаў прамысловасці, будаўніцтва, транспарту за датэрміновае выкананне народнагаспадарчага плана на 1974 год».

Па ўсёй краіне шырока разгарнуўся патрыятычны рух за прыняцце высокіх сацыялістычных абавязацельстваў з мэтай азнаменаваць 1974 год—вызначальны год дзевятай пяцігодкі — ударнай працай.

Актыўна ўключыцца ў сацыялістычнае спаборніцтва, унесці свой важкі ўклад у справу ўдасканалення вышэйшай адукацыі, падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў сучаснага ўзроўню заклікае пастанова рэктарата, парткома, мясцкома, камітэта камсамола і прафкома БДУ.

Сацыялістычнае спаборніцтва ва універсітэцкіх падраздзяленнях, як падкрэслена ў пастанове, павінна развівацца па такіх напрамках:

— удасканаленне вучэбнага працэсу на аснове яго навуковай арганізацыі, укараненне новых, прагрэсіўных метадаў навучання з прымяненнем тэхнічных сродкаў, вызначэнне і сістэматычнае абнаўленне навуковага зместу выкладання ўсіх вучэбных дысцыплін;

— павышэнне ўзроўню вучэбна-выхаваўчай і навукова-метадычнай работы ўсіх кафедр;

— узмацненне работы па своечасовай падрыхтоўцы і выданню падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, асабліва па навейшых напрамках навукі і тэхнікі;

— паляпшэнне работы служб, якія павінны забяспечваць прафесарска-выкладчыцкі састаў, студэнтаў і навуковых супрацоўнікаў універсітэта навукова-тэхнічнай інфармацыяй;

— распрацоўка і ажыццяўленне мерапрыемстваў па тэхнічнаму перааснашчэнню кафедр, вучэбных і навукова-даследчых лабараторый сучасным абсталяваннем і прыборамі;

— пастаяннае павышэнне тэарэтычнага ўзроўню і эфектыўнасці навуковых даследаванняў, актыўнае ўкараненне вынікаў навуковых даследаванняў у сферу матэрыяльнай вытворчасці і вучэбна-выхаваўчы працэс;

— умацаванне матэрыяльнай базы універсітэта, будаўніцтва новых вучэбных карпусоў і інтэрнатаў;

— шырокае далучэнне студэнтаў да навукова-даследчай работы.

## У РЭКТАРАЦЕ

Павестка дня пасяджэння рэктарата, якое адбылося ў панядзелак, уключала два пытанні: «Аб выкананні плана размеркавання маладых спецыялістаў і з'яўленні іх на работу»; «Аб рабоце кафедры грамадзянскай абароны».

Начальнік аддзела кадраў БДУ І. Ф. Кастроў, які дакладваў па першаму пытанню, прывёў лічбу плана размеркавання маладых спецыялістаў 1973 года—1628 і лічбу фактычнай колькасці выпускнікоў, якія атрымалі прызначэнні,—1453. Права на самастойнае ўладкаванне на працу было дадзена 175 выпускнікам. На 14 снежня атрымана 1342 пацвярджэнні аб прыбыцці выпускнікоў БДУ на работу.

Дакладчык прааналізаваў прычыны, па якіх план размеркавання не быў поўнасцю выканан, звярнуў увагу на цяжкасці, што мелі месца пры размеркаванні выпускнікоў некаторых спецыяльнасцей.

Пры абмеркаванні першага пытання павесткі дня былі выказаны прапановы, каб дэканаты падтрымлівалі больш цесныя кантакты з выпускнікамі, цікавіліся іх лёсам, пры неабходнасці своечасова прыходзілі ім на дапамогу.

У адказ на пытанне аб мерах пакарання тых кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў, якія незаконна прымаюць на працу маладых спецыялістаў, т. Кастроў прывёў прыклады, калі кіраўнікі атрымалі спагнанні, а маладыя спецыялісты былі звольнены з работы.

На пасяджэнні ішла гутарка і аб размеркаванні маладых спецыялістаў сёлетняга выпуску.

* * *

Падрабязны даклад аб стане работы кафедры грамадзянскай абароны зрабіў яе загадчык Л. А. Фралоў. З садакладам выступіў інспектар вучэбнага аддзела М. С. Нікіценка.

Адзначана паляпшэнне дзейнасці калектыву кафедры ў апошні час. Выказаны меркаванні і прапановы па далейшаму ўдасканаленню яе работы.

## У НАС У ГАСЦЯХ ГЕРОЙ КОСМАСУ!

Учора з раніцы ўвага ўсяго універсітэцкага калектыву была прыкавана да геаграфічнага корпуса, дзе з нецярпеннем чакалі прыбыцця на сустрэчу са студэнтамі, выкладчыкамі, супрацоўнікамі БДУ лётчыка-касманаўта, Героя Савецкага Саюза Пятра Ільіча Клімука.

І вось маланкава пранеслася вестка: дарагі госць уступіў на тэрыторыю геафака. Шчырыя, гарачыя апладысменты, радасныя ўсмешкі, яркі лозунг «Студэнцкае прывітанне герою космасу!» сустрэлі Пятра Ільіча ў самай вялікай аўдыторыі. Сакратар парткома Т. Я. Дударава ад імя прысутных горача віншуе праслаўленага героя і нашага земляка і прадастаўляе яму слова.

У імгненне, ужо са звароту да аўдыторыі: «Дарагія рабяты, студэнты, выкладчыкі! Мне вельмі прыемна прысутнічаць у Беларусі, у Мінску...» землякоў звязалі моцныя вузы сімпатыі і ўзаемаразумення.

Пётр Ільіч расказвае аб сваім нялёгкім, поўным вялікай працы, шляху ў космас. Падрабязна гаворыць аб васьмі днях, праведзеных экіпажам карабля ў касмічнай прасторы, аб задачах, якія даваліся выконваць, самаадчуванні, уражаннях. А затым ахвотна адказвае на пытанні, у якіх нямала спецыфічнай зацікаўленасці географаў: аб вышыні палёту, саставе атмасферы і аб'ёме карабля, бачнасці зямных аб'ектаў і іх каляровым выглядзе...

А потым ад імя студэнтаў героя космасу вітала студэнтка III курса геафака Аня Трацэўская. Яна выказала пачуцці студэнтаў, усхваляваных сустрэчай, пажадала Пятру Ільічу новых палётаў і шчаслівых прызямленняў.

На памяць аб знаходжанні ва універсітэце т. Дударава паднесла касманаўту сувенір, а дзяўчаты падарылі Пятру Ільічу кветкі.

— Вялікае дзякуй за цёплы прыём! Вялікіх вам поспехаў у вучобе, творчых дасягненняў у жыцці! — гаворыць на развітанне П. І. Клімук.

## ПРЫСВЕЧАН У. І. ЛЕНІНУ

Чарговы выезд на аўтазавод групы лектараў БДУ, які быў прысвечан памяці У. І. Леніна, прайшоў пад дэвізам «Ідэі У. І. Леніна — у жыццё».

У абедзенны перапынак у цэхах, ленінскіх кутках гучаў голас універсітэцкіх лектараў. «Самы чалавечны чалавек»—тэма выступлення дацэнта Г. Г. Герасіменкі. З лекцыяй «У. І. Ленін і Н. К. Крупская» выступіў дацэнт У. П. Мешчаракоў. Дацэнт М. Я. Рэзнікаў прапанаваў сваім слухачам лекцыю «У. І. Ленін і электрыфікацыя краіны».

Ажыццяўленню ленінскіх ідэй, велічным пераўтварэнням, якія адбыліся ў нашай краіне за гады Савецкай улады, выдатным дасягненням у развіцці навукі прысвяцілі свае выступленні выкладчыкі А. В. Ераксін і Ф. І. Мельнік. Дацэнт П. І. Зялінскі расказаў аб міжнароднай палітыцы СССР. Ст. навуковы супрацоўнік фізфака І. С. Манак пазнаёміў рабочых інструментальна-штампавага корпуса з лазерамі і іх прымяненнем.

Слухачы былі вельмі задаволены цікавымі лекцыямі і з вялікай цеплынёй падзякавалі прадстаўнікам лектарскага калектыву.

* * *

Члены універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» рэгулярна выступаюць з лекцыямі ў падшэфных арганізацыях. Нядаўна ў Дзяржынскую лекцыі для прапагандыстаў прачыталі А. І. Цітоў і М. Я. Зайцаў.

*Сесія падыходзіць к канцу. Застаўся яшчэ адзін, рашаючы рывок. А напераддзе — канікулы.* *(Матэрыялы, прысвечаныя сесійным дням, гл. на 2-й стар.).*



*НА ЗДЫМКАХ: экзамен па гісторыі краін Азіі і Афрыкі ў студэнтаў III курса гістарычнага факультэта прымае У. С. Кошалеў.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*



## МНОГАНАЦЫЯНАЛЬНАЙ СЯМ'ЁЙ

Наш універсітэт адносіцца да ліку інтэрнацыянальных вну краіны. Цяпер на яго асноўных і падрыхтоўчым факультэтах займаецца 346 студэнтаў з 23 краін свету. У сувязі з гэтым да работы камітэтаў камсамола універсітэта, факультэтаў, дзе навучаюцца замежныя студэнты, прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні па інтэрнацыянальнаму выхаванню савецкіх і замежных студэнтаў.

Інтэрнацыянальнае выхаванне камітэтам камсамола універсітэта і камітэтамі камсамола факультэтаў праводзіцца па трох асноўных напрамках: работа з зямляцтвамі замежных студэнтаў; азнаямленне замежных студэнтаў з савецкай рэчаіснасцю, прыцягненне іх да грамадскай работы; інтэрнацыянальнае выхаванне савецкіх студэнтаў. Гэтыя напрамкі склаліся як вынік вопыту і традыцый камсамольскай работы ва універсітэце.

У рабоце з зямляцтвамі выкарыстоўваецца дагаворная сістэма, якая ўключае агульныя напрамкі сумеснай дзейнасці і асноўныя мерапрыемствы. Камітэт камсамола філалагічнага факультэта сумесна з зямляцтвам нямецкіх студэнтаў правёў вечар, прысвечаны 24-й гадавіне ўтварэння ГДР. ФПМ у садружнасці з зямляцтвам балгарскіх студэнтаў і саветам дружбы універсітэта арганізавалі вечар, прысвечаны Дню балгарскага студэнта. 19 снежня студэнты фізічнага факультэта на мітынгу горача павіншавалі в'етнамскіх сяброў са святам—гадавінай утварэння Нацыянальнага фронту.

Інтэрсектар фізічнага факультэта аказвае дапамогу савету дружбы ў афармленні пакоя дружбы ў інтэрнаце № 7. В'етнамскія студэнты рэгулярна трэніруюцца ў спартыўнай зале разам з савецкімі студэнтамі — у гэтым таксама немалая заслуга інтэрсектара фізічнага факультэта, які ўзначальвае студэнт IV курса Аляксандр Кавалёў.

Работа па азнаямленню замежных студэнтаў з савецкай рэчаіснасцю вельмі разнастайная. Гэта і экскурсіі па памятных месцах Мінска і рэспублікі, выезды ў іншыя гарады Савецкага Саюза, паездкі па ленінскіх мясцінах. У адным з такіх падарожжаў па маршруту Мінск—Масква—Казань— Ульянаўск — Ленінград замежныя студэнты азнаёміліся з жыццём і дзейнасцю У. І. Леніна. Былі арганізаваны паездкі па месцах баявой славы нашага народа: у Маскву, Волгаград, Кіеў, Ленінград, Брэст, Хатынь, на Курган Славы.

Асноўнае месца ў рабоце інтэрсектараў удзяляецца інтэрнацыянальнаму выхаванню савецкіх студэнтаў. Лекцыі і інфармацыі па пытаннях маладзёжнага міжнароднага руху, знаёмства з маладзёжнымі саюзамі краін, студэнты з якіх навучаюцца ў БДУ, займаюць трывалае месца ў дзейнасці групавых камсамольскіх арганізацый.

Штогод ва універсітэце праводзіцца традыцыйны фестываль дружбы, у плане якога прадугледжваюцца канферэнцыі па праблемах маладзёжнага руху, экскурсіі і сустрэчы з рабочымі прадпрыемстваў, наведанне памятных мясцін нашай сталіцы, агляд мастацкай самадзейнасці замежных студэнтаў.

Трэба адзначыць актыўную работу па інтэрвыхаванню Уладзіміра Ламекі на філалагічным факультэце, Алены Махнач на ФПМ, Ірыны Падасенавай на матфаку, членаў інтэрсектара універсітэта Людмілы Качкоўскай, Людмілы Шарпан, Васіля Кузьміча і іншых.

**Т. КРАЎЦОВА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ.**

# І ЯШЧЭ АДЗІН ДЗЕНЬ

Сёння здаюць экзамен студэнты III курса аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта. Падыходжу да аднаго з іх. Шчыра кажучы, яму не да мяне — старанна перагортвае канспект. І ўсё ж пытаю:

— Што здаяце?

— Гісторыю і тэорыю атэізму, — чуецца ў адказ.

Вось цяпер самы момант увайсці ў аўдыторыю. Дацэнт Віктар Аляксандравіч Молакаў сустракае ветліва. На момант падымаюць галовы студэнты, але экзамен ёсць экзамен, і зноў іх позіркі прыкаваны да паперы.

За сталом адказ працягвае дзяўчына. Яна ўпэўнена адказвае на пытанне.

— Выдатна, — гаворыць Віктар Аляксандравіч і вяртае Лене Пракапенка залікоўку.

— Добры дзень, — у аўдыторыю ўваходзіць юнак. Ён крыху збянтэжан. Па залікоўцы знаёмлюся. Гэта Міхаіл Філімоненка. Сесія пакуль што не прынесла Мішу засмучэння. Ён здаў тры экзамены і ўсе на выдатна.

Міша глядзіць у білет. Па твару, а ў гэты момант ён святлее, можна меркаваць — ведае.

Пакуль «наш» студэнт рыхтуецца да «бою», паслухаем адказы яго таварышаў. Вось Уладзімір Шчур. Пытанні ў яго цікавыя — «Прынцыпы КПСС і Савецкай дзяржавы ў адносінах да рэлігіі і царквы», «Узнікненне і эвалюцыя міфа аб Хрысце». Але адказвае Уладзімір слаба.

— Дакладней трэба называць творы У. І. Леніна, не адыходзіць ад пытання,— гаворыць педагог і ставіць «здавальняюча».

Вось вельмі добра адказалі трое студэнтаў, і падышла чарга Міхаіла Філімоненкі.

Хваляванне схаваць нельга. Але Міша адказвае хутка, выразна, бездакорна. «Бой» амаль выйгран. Але дадатковае пытанне экзаменатара... і маўчанне.

— Ваш адказ, — з жалем гаворыць Віктар Аляксандравіч, — лепш чым «добра», але горш, чым «выдатна».

У выніку—чацвёрка.

Што ж, хоць гэта і нельга назваць няўдачай, але прыйдзецца задумацца.

...За вокнамі ўжо сцямнела, калі адказваў апошні з групы.

— Віктар Аляксандравіч, што Вы больш за ўсё цэніце ў адказах студэнтаў?

— Глыбіню, грунтоўнасць ведаў. На семінарах — самастойнасць мыслення, нават калі адказ памылковы.

— У сувязі з гэтым што Вы пажадаеце студэнтам у час сесіі?

Апошні апытваемы адказваў дрэнна, таму я пачула:

— Вельмі важна студэнту не губляць пачуцця ўласнай годнасці, гонару.

Т. ЛУЙГАС.



# ВЫПРАБАВАННЕ ПРАЙШЛО ПАСПЯХОВА

Гавораць, што першакурснікі не могуць лічыцца сапраўднымі студэнтамі да той пары, пакуль не здадуць сваю першую сесію, не атрымаюць «баявое хрышчэнне». І таму хоць вечар пасвячэння на гістфаку даўно прайшоў, а студэнцкія білеты і заліковыя кніжкі атрыманы, на душы ў філосафаў першага курса было неспакойна. Страшыла невядомасць: што ж такое гэта будучая сесія? Засыпалі пытаннямі старшакурснікаў, слухалі чужыя парады, але калі - няма свайго вопыту, словы не дапамагаюць.

І вось, нарэшце, наступіла сесія. Першая ластаўка —экзамен па гісторыі СССР. Колькі было страху і сумненняў перад тым, як адважышся выцягнуць білет! Але ўсё прайшло як нельга лепш. Аказалася, не такі страшны чорт, як яго малююць, і калі добра падрыхтаваўся, любы білет здаецца шчаслівым. У выніку —ніводнай тройкі. Поспех акрыліў групу.

Але наперадзе куды больш складанае выпрабаванне—«Асновы вышэйшай матэматыкі». Шчыра кажучы, ой як нялёгка даваліся многім гэтыя самыя «асновы». Канешне, учарашнія школьнікі без цяжкасцей засвоілі курс, вельмі важны для будучых філосафаў і сацыёлагаў. Але такіх у групе—меншасць. У асноўным жа на філасофскім аддзяленні вучацца рабяты, у якіх за плячыма армія, працоўны стаж. Таму, каб паспяхова справіцца з праграмай, група напружана займалася на працягу ўсяго семестра. Тыя, хто прыйшоў у вну прама са школьнай парты (Люба Акенчыц, Раіса Нурыева, Люда Сямёнава і інш.) не шкадавалі часу для тлумачэння незразумелага матэрыялу. У групе ўсе спаборнічаюць адзін з другім, але гэта зусім не перашкаджае аказваць дапамогу. Поспехі ж сябра—гэта і твае поспехі. Вельмі многа карысці далі таксама дадатковыя заняткі, якія сістэматычна праводзіла выкладчыца А. А. Нахімоўская.

Экзамен паказаў, што праца не прапала марна: усе атрымалі «добра» і «выдатна». Гэта была ўжо сапраўдная перамога. І хоць наперадзе яшчэ адзін экзамен, можна з упэўненасцю сказаць, што сваё першае выпрабаванне філосафы-першакурснікі вытрымалі паспяхова.

Л. ЦІТАРЭНКА,
студэнтка IV курса аддзялення філасофіі.

# НАДЗЁННЫ КЛОПАТ

Трэба адразу заўважыць: з пераходам на ступень вышэй, на другі курс, наша група змянілася. Пасталела. А разам з гэтым на змену першапачатковаму напружанню прыйшло нейкае заспакаенне, несапраўдная студэнцкая сталасць. І, напэўна, гэта самазаспакоенасць, самаўпэўненасць з'явілася прычынай таго, што каляндар цяперашняй сесіі ў параўнанні з мінулым годам выглядае даволі страката. Калі на першым курсе вока вабілі стабільныя «выдатна» і «добра», то зараз, пасля трох экзаменаў група мае адзнакі: «выдатна»—23, «добра»—48, «здавальняюча»—11, «нездавальняюча»—1.

Наперадзе чацвёрты, завяршальны экзамен. Аднак прычыны зніжэння паспяховасці відавочны ўжо зараз. Пра іх і хацелася б пагутарыць.

Па-першае, практыка паказвае, што дысцыпліны, па якіх вядуцца практычныя заняткі, студэнты здаюць значна лепш, чым тыя, па якіх такіх заняткаў няма. Возьмем, напрыклад, такі факт. Па гісторыі КПСС у гэтым годзе наша група павінна была здаваць экзамен па даволі вялікаму перыяду дзейнасці Кампартыі. І мы паспяхова справіліся са сваёй задачай. Аб гэтым сведчаць і добрыя адзнакі і не менш добры водгук экзаменатара. Тут мелі значэнне практычныя заняткі, штодзённая падрыхтоўка да іх. Перад экзаменам заставалася толькі паўтарыць, удакладніць атрыманыя веды.

А вось на наступным экзамене, па гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры, група атрымала шмат троек. Прадмет патрабуе вывучэння не толькі спецыяльнай літаратуры, але і чытання мастацкіх твораў. І калі студэнт у час непасрэднай падрыхтоўкі грунтоўна вывучаў тэорыю, то тэксты не мог прачытаць у дастатковым аб'ёме. А калі б былі практычныя, то і тым, каму яшчэ не хапае сапраўднай самастойнасці, давялося б узяцца за кнігу своечасова.

Па-другое, нельга забываць вядомую ісціну: «Тэорыя без практыкі мёртвая». Гэта палажэнне ў тэорыі і практыцы журналістыкі з'яўляецца патрабаваннем. Колькі ні чытай метадычнай літаратуры па своеасаблівасцях тых ці іншых жанраў, а пакуль сам не возьмешся за пяро—тэорыя застаецца толькі тэорыяй. Гэта добра разумеюць студэнты-журналісты. Разумеюць, усведамляюць... і ўспамінаюць аб гэтым толькі напярэдадні экзамена. І тады на старонках мясцовых газет паяўляюцца заметкі, інтэрв'ю, замалёўкі за подпісам «студэнт факультэта журналістыкі», а выкладчыку на экзамене прад'яўляюцца два-тры матэрыялы, па якіх цяжка меркаваць, наколькі тэорыя замацавана практыкай. А ў выніку ўсяго — «здавальняюча». Аднак такая адзнака не задавальняе не толькі выкладчыка, студэнта, але і дзяржаву. Гэта не гучныя словы, а аб'ектыўны вывад.

Па-трэцяе. Здаўна старасту групы лічаць адказным як за вучэбную дысцыпліну, так і за акадэмічную паспяховасць. Але ў час экзаменаў становіцца відавочным, што адных клопатаў старасты недастаткова. Часта ён з'яўляецца адзіным у групе адказным за паспяховасць. А дзе ж партыйна-камсамольскі актыў? Хіба паспяховасць не пытанне № 1 пасяджэнняў бюро, сходаў?

Паспяховасць не павінна быць справай адной асобы, гэта — клопат усёй групы. І ў першую чаргу партыйна-камсамольскі актыў павінен неадкладна рэагаваць на заўважаныя недахопы і строга патрабаваць з нядбайных.

І, нарэшце, гэта сесія зноў пераканаўча пацвярджае ўжо даўно вядомае: трэба вучыцца на працягу года. Дрэннае наведванне заняткаў, няўважлівасць на лекцыях, несур'ёзная падрыхтоўка да практычных заняткаў — усё гэта становіцца каменем спатыкнення ў час экзаменаў, і менавіта на гэтыя надзённыя пытанні неабходна звярнуць пільную ўвагу ў новым вучэбным семестры, бо поспех куецца ў штодзённасці.

Г. МАРОЗАЎ,
староста II групы
журфака.

# АПОШНІ АКОРД СЕСІІ





Ідзе сесія і на падрыхтоўчым факультэце. Экзамен па хіміі прымае ст. выкладчык Н. Г. Чумакова.
Рыхтуецца да адказу Нгуен Тхі Цінь.

# СУПРАЦЬ ЗАКОНА ІНЕРЦЫІ

## ДЫЯЛОГ З АДКАЗНАЙ ЗА АКАДЭМІЧНЫ СЕКТАР I і II КУРСАЎ ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА НАТАШАЙ ПАЎЛОЎСКАЙ.

— Наташа, табе, безумоўна, знаёмы закон Ньютана: «...цела захоўвае стан спакою ці прамалінейнага раўнамернага руху, пакуль да яго не будзе прыкладзена сіла». Але давай пагаворым не аб інерцыі фізічных цел, а аб інерцыі студэнтаў у адносінах да вучобы. І так, малады чалавек адразу ж са школьнай парты, пераступіўшы парог вну, становіцца студэнтам. Ён рад: ажыццявілася яго запаветная мара. Але ў той жа час ён не падазрае аб тых цяжкасцях, з якімі прыйдзецца ўпершыню сутыкнуцца. І перш за ўсё па інерцыі ён патрабуе апекі, як у школе, з боку настаўніка. Ці можа акадэмічны сектар, калі ўлічваць усе яго магчымасці, папярэдзіць студэнта аб магчымых перашкодах, якія чакаюць яго на шляху да вышэйшай адукацыі? Ці сектар не патрэбен зусім?

— Не, акадэмічны сектар патрэбен, і асабліва першакурсніку. Чалавек сутыкаецца з зусім незнаёмай сістэмай, ён не прывык яшчэ да самастойнасці. Ён спакойны, таму што не чуе за сабой голаса «Марыі Іванаўны». І ў той жа час яму страшна — вельмі вялікі паток інфармацыі абрушваецца на яго адразу. Надыходзіць сесія, ён хвалюецца, спрабуе штосьці рабіць, але ўжо бывае позна.

— І вы вырашылі: трэба штосьці рабіць!

— Рабілі. Мала дапамагае. Вось узяць хоць бы такое мерапрыемства: збіраем усіх першакурснікаў, размаўляем з імі, папярэджваем, раім, як рыхтавацца да таго або іншага экзамена, але праходзіць час, і яны зноў заспакойваюцца. Тут, па-мойму, прычына ў тым, што менавіта ў школе нас не прывучаюць да самастойнасці, а трэба было б.

— І ты думаеш, гэта выкліча адмену такой меры пакарання, як выключэнне?

— Не, выключэнні будуць, але будзе лягчэй на душы ад упэўненасці, што чалавек не туды трапіў, што сваё «назначэнне высокае» яму належыць шукаць у другой галіне. А цяпер жа таму, што не прыжыўся ў новых умовах, з першага курса можа быць выключан і вельмі здольны.

— Але рашаць гэту праблему трэба у бліжэйшы час, сваімі ж сіламі. Трэба зрабіць так, каб першакурснікі адчувалі «дыханне» акадэмічнага сектара. Можа, трэба назначаць адказным не першакурсніка, а старшакурсніка? Але у вас жа на кожным курсе каля 400 чалавек, і старшакурсніку на знаёмства патрэбен час. А яму ж проста нявыгадна прапускаць лекцыі, адрывацца ад вучобы?

— Я лічу, што за акадэмсектар павінен адказваць або супрацоўнік, або чалавек, які спецыяльна для гэтага прызначан Тады, па-мойму, будзе зрух.

— І будзе больш галоснасці.

— Так, так. Рэгулярней будуць склікацца злёты выдатнікаў, цікавей запрацуе штаб выдатнікаў, можна будзе нават выпускаць газету гэтага штаба, будзе сур'ёзней і патрабавальнасць. Тады расшырыцца і дошка выдатнікаў.

— І паменшыцца дошка двоечнікаў?

—У нас такой няма, хоць, магчыма, яна і патрэбна. Мы абмяжоўваемся табель-календаром, дзе супраць прозвішча студэнта выстаўляем адзнакі сесіі. З мэтай прафілактыкі высылаем бацькам непаспяваючых паштоўкі, каб ведалі, як займаецца іх сын ці дачка. Гэта калі-нікалі дапамагае.

— Ну, а што залежыць ад выкладчыка?

— Многае. Перш за ўсё ён павінен разумець студэнта і патрабаваць, але разумна. Прывяду прыклад. Спачатку лекцыі і практычныя заняткі вёў добры і цікавы чалавек. І мы, карыстаючыся яго дабратой, абмяжоўваліся толькі падручнікам, для нас гэтага было дастаткова і, як нам здавалася, мы ўсё ведалі. Але вось прыйшоў новы выкладчык. На другія яго практычныя заняткі не прыйшла палова групы. Так паўтаралася да той пары, пакуль сам выкладчык не знайшоў прычыну. Аказалася, што патрабуе ён значна больш. З-за страху трапіць у няёмкае становішча многія не выступалі на занятках. І тады ён па-іншаму пачаў весці практычныя. Паявілася зацікаўленасць. Важна ў час зразумець студэнта.

А. ХІЛІМОН,
студэнт.







# НА ХІМІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

**● ФОТАРЭПАРТАЖ М. НЕЧЫПАРЭНКІ**

*Часта ў гэты высотны будынак да універсітэцкіх хімікаў прыходзяць інжынеры, кіраўнікі прадпрыемстваў, былыя выпускнікі — за парадай, на кансультацыю, дамовіцца аб супрацоўніцтве.*

*Хімічны факультэт усё больш умацоўвае сувязі з вытворчасцю. Яго навуковы калектыў імкнецца зрабіць больш важкі ўклад у развіццё народнай гаспадаркі рэспублікі.*

## ДЛЯ ПАТРЭБ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Дэкан факультэта Г. А. Браніцкі расказвае:

— Выконваючы рашэнні XXIV з'езда КПСС, наш факультэт яшчэ больш пашырыў свае сувязі з прадпрыемствамі рэспублікі, аказвае ім пастаянную дапамогу ў вырашэнні складаных вытворчых задач.

Формы супрацоўніцтва? Яны разнастайныя. Мы выконваем работы, абумоўленыя гаспадарчымі дагаворамі, з Магілёўскім - заводам штучнага валакна, прамыслова-тэхнічным аб'яднаннем «Інтэграл», заводам ЭВМ імя С. Арджанікідзе, Полацкім нафтахімічным камбінатам і многімі іншымі.

На кафедры аналітычнай хіміі працуе семінар для супрацоўнікаў заводскіх лабараторый па фізіка-хімічных метадах аналізу. Тут яны могуць атрымаць кансультацыю па выніках вопытаў.

А цяпер заглянем у лабараторыі вучоных-хімікаў. Хочацца падрабязней расказаць аб адным пагадненні, заключаным паміж Полацкімі хімікамі і вучонымі кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі.

Полацкі нафтаперапрацоўчы завод — маладое прадпрыемства, адно з буйнейшых у краіне. Нягледзячы на гэта, тут практычна яшчэ не вырашана актуальная праблема — ачыстка прамысловых адходаў.

І вось хімікі БДУ ўзяліся дапамагчы вырашыць гэтую праблему. У Полацк выязджаў прадстаўнік факультэта ст. інжынер кафедры В. М. Шчурын. Ён падрабязна азнаёміўся з тэхналогіяй вытворчасці, работай нафтахімікаў. Потым на нарадзе спецыялістаў прапанаваў новы метад, які праходзіць выпрабаванні на кафедры.

У выніку лабараторных работ мінулага года быў створан макет будучай устаноўкі. На наступным этапе зроблен крок для атрымання даных, неабходных для праектавання вопытна-прамысловай устаноўкі. Выгада яе і новага метаду ачысткі ў тым, што рэзка скарачаецца выхад шкодных газаў, у цэх вяртаюцца каштоўныя хімічныя рэчывы.

Першыя даследаванні паказалі, што кошт ачысткі газаў спосабам, які распрацоўваюць хімікі БДУ, прыблізна ў 10 разоў ніжэй найбольш перспектыўнага азона-каталітычнага. Яго практычнае ўкараненне на Полацкім нафтаперапрацоўчым заводзе дазволіць закончыць поўны рабочы цыкл прадпрыемства і будзе навінкай для іншых падобных заводаў Саюза.

Эксперымент паспяхова працягваецца. Над распрацоўкай новага метаду працуюць навуковы кіраўнік тэмы загадчык кафедры дацэнт Яўген Пятровіч Пятраеў, кіраўнік творчай групы старшы інжынер кафедры Валерый Мікалаевіч Шчурын, навуковы супрацоўнік Галіна Францаўна Мішук і іншыя. У бягучым годзе калектыў разлічвае зрабіць першыя прыстасаванні ўстаноўкі да ўмоў і спецыфікі завода, падвесці вынікі работы, якая вядзецца на працягу амаль двух гадоў.

**М. ШЛЫК,**
**студэнт.**

## АД СТУДЭНТА ДА НАСТАЎНІКА — АДЗІН КРОК

Але каб зрабіць яго, трэба адолець горы падручнікаў, сваімі рукамі правесці сотні эксперыментаў, загартаваць волю і выпрацаваць характар.

І гэтага мала. Толькі непасрэдна ў школе, у час самастойных урокаў нараджаецца настаўнік.

Менавіта тут праходзяць выпрабаванне практыкай засвоеныя тэарэтычныя веды, метадычныя прыёмы, пакрысе накопліваецца вопыт, які пакладзе пачатак майстэрству.

Кожны год сотні выхаванцаў універсітэта спрабуюць свае сілы на настаўніцкай ніве.

На гэтых здымках вы бачыце студэнтку V курса хімічнага факультэта Валянціну Маркоўскую ў час школьнага ўрока.

**На здымку ўнізе:** цяпер можна абмяняцца ўражаннямі з настаўніцай сярэдняй школы № 90 г. Мінска, дзе студэнты праходзяць практыку, Р. С. Раут і таварышамі — Ірынай Цішчанка і Мікалаем Пупейкам.



## ПЕРШАЕ ЗНАЁМСТВА

«Хімік»—галоўная факультэцкая газета. У ёй расказваецца аб лепшых людзях, выдатніках і аб тых, чые паводзіны выклікаюць трывогу.

Ленінскі залік, падрыхтоўка да сесіі і здача экзаменаў, арганізацыя самадзейнасці... Усіх нас хвалююць гэтыя пытанні. Хвалююць яны і «Хіміка». Нездарма ім тут адводзіцца самае віднае месца.

А вось паглядзіце:

...Раніца... Цішыня, якая можа быць толькі ў горнай даліне... Горы, высокія і спакойныя, узнімаюцца з усіх бакоў. Узыходзячае сонца серабрыць іх вяршыні. А ля самага падножжа—палаткі. Ні гуку! Спяць яшчэ... Наперадзе чарговы нялёгкі пераход. Спяць, упэўненыя і бесклапотныя—усё будзе добра. Камандзір да драбніц прадумаў кожную дэталь, магчымыя і немагчымыя здарэнні. А ён не спіць і ў гэтую раніцу. «Сем разоў адмерай...» Не сёмы, а мо ўжо 107-ы раз абдумвае план чарговага пераходу Сяргей Нікалюк—«шэф», як называюць яго сябры-турысты. Нялёгкая доля ў камандзіра!

І яшчэ адна адказная асоба не зведала асалоды ранішняга сну—повар. Патрэскваюць дровы на кастры, кіпіць у кацялку вада... Сняданак павінен быць гатовы строга па распарадку.

А дні былі розныя. Нямала пройдзена цяжкіх участкаў: бурлівыя, агрэсіўныя рэчкі, крутыя пад'ёмы. Стаялі потым на вяршыні, як багі, заварожаныя, крыху гордыя сабою.

Шмат светлых і радасных хвілін давялося перажыць.

«...Міша Фрэнкель, ён жа Завей-Барадка» ...Прабачце, гэта толькі подпіс, а дзе ж здымак? На месцы фатаграфіі толькі жоўтая пляма ад клею. Садраў нехта!

— Прычым тут здымак Мішы Фрэнкеля?— здзівіцеся вы.—І, наогул, гэты расказ? А справа ў тым, што ўсё гэта мы ўбачылі і адчулі, калі разглядалі фотагазету хімікаў «Па Заходняму Каўказу».

Нездарма слова «нахімічыць» ужываецца ўсюды, нават у поварскай справе. У навагоднім нумары газеты можна знайсці рэцэпты самых неверагодных страў! Ад шашлыкоў, прыгатаваных з косці, да святочнага пірага з клею БФ-88.

Смешна? Але хімікі не толькі смяюцца і жартуюць. Яны і хвалююцца, турбуюцца. Аб гэтым сведчыць апошні выпуск «Маланкі», у якім адчуваюцца клопат аб грамадскай маёмасці, турботы аб чысціні сталоў. Заметка невядомага аўтара дапаўняе вобраз студэнта-хіміка яшчэ некалькімі рысамі. Аказваецца, акрамя хіміі, яго цікавіць шырокае кола пытанняў і праблем, аб чым сведчаць надпісы на аўдыторных сталах. Такія, напрыклад, як: «Што такое квантавая механіка?» і «Што такое каханне?», «У чым сэнс жыцця?» і «Дзе знайсці шчасце?»

Наогул, хімікі, як і ўсе студэнты, у першую чаргу вялікія жыццялюбы і невычарпальныя аптымісты.

**М. ШЫМКО,**
**С. ТРУКШЫНА.**

## ЗДАЁМ НОРМЫ ГПА



У мінулым годзе хімічны факультэт заняў першае месца ва універсітэце па абароннай і другое па спартыўна-масавай рабоце. Гэта —вынік вялікай работы калектыву.

На факультэце сістэматычна працаваў гурток па стральбе з вінтоўкі і пісталета. Падрыхтавана вялікая колькасць разраднікаў. Больш паловы студэнтаў факультэта здалі па гэтаму віду нормы ГПА.

Сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай і грамадзянскай войнаў, Героямі Савецкага Саюза, паходы па месцах баявой, працоўнай і рэвалюцыйнай славы, наведанне музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, паездкі ў Хатынь, на Курган Славы, у Брэсцкую крэпасць і па іншых памятных месцах, дэманстрацыя кінафільмаў на ваенна-патрыятычныя тэмы, арганізацыя спартыўных і ваенна-патрыятычных вечароў — такі далёка не поўны пералік нашых спраў.

Нядаўна быў арганізаван агульнафакультэцкі турыстычны паход з мэтай здачы норм ГПА. У ім прыняў удзел 341 чалавек.

На факультэце праводзіліся спаборніцтвы па шашках, шахматах, стральбе, валейболу, баскетболу, арганізоўваліся таварыскія сустрэчы па шахматах і валейболу паміж студэнтамі і супрацоўнікамі факультэта.

Пры кафедры фізічнай хіміі арганізавана секцыя па валейболу мужчынскіх і жаночых каманд, якой кіруе спартсмен - першаразраднік, старшы інжынер А. В. Махнач.

Вялікую ўвагу мы ўдзяляем правядзенню выхадных дзён. Арганізавалі некалькі лыжных вылазак пад кіраўніцтвам спартсмена І разраду К. І. Лапко. У час гэтых вылазак многія ўдзельнікі здалі нормы ГПА.

Па здачы норм ГПА хімічны факультэт займае другое месца ва універсітэце. Поўнасцю здалі нормы ГПА 164 чалавекі, з іх 8 — на залаты значок.

**Р. МІЛЬКІН,**
**старшыня спортбюро хімічнага факультэта.**



# НА ВАШУ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ

КНІГІ, вокладкі якіх вы бачыце на фотаздымку, выйшлі ў выдавецтве БДУ ў 1973 годзе. Напісаны яны ў асноўным выкладчыкамі і супрацоўнікамі універсітэта і нядаўна з'явіліся ў продажы. Набыць іх можна ва універсітэцкім кіёску.

Цудоўна афармленая кніга Д. Б. Мельцара і П. З. Савачкіна **«Беларусь і Балгарыя — дружба, супрацоўніцтва, братэрства»** прысвечана 25-годдзю з дня падпісання дагавору аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж Савецкім Саюзам і Народнай Рэспублікай Балгарыяй. У ёй чытач знойдзе шмат цікавага аб развіцці грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва паміж СССР і НРБ, аб ролі нашай рэспублікі ва ўмацаванні савецка-балгарскай дружбы.

Выйшла трэцяя частка **«Гісторыі прыметнікаў беларускай мовы»** М. Г. Булахава. У кнізе на матэрыяле старабеларускіх пісьмовых помнікаў розных жанраў літаратуры і дзелавых дакументаў перыяду XIV—XVII стагоддзяў высвятляецца паходжанне і далейшае развіццё 260 лексем—адносных і якасных прыметнікаў. Галоўная ўвага звяртаецца на семантычнае развіццё прыметнікаў.

**«Практыкум па гісторыі савецкага грамадства (1917—1971)»** У. Н. Сідарцова мае мэтай дапамагчы студэнтам-гісторыкам завочнага факультэта ў падрыхтоўцы да практычных заняткаў, залікаў і экзаменаў, у напісанні кантрольных і курсавых работ. Ён можа быць выкарыстан аспірантамі, настаўнікамі сярэдняй школы, выкладчыкамі вну, прапагандыстамі.

Па асноўных тэмах курса дадзены пытанні і тлумачэнні да іх, названы крыніцы і навейшая літаратура, прыведзены дакументы, якія павінны вывучыць студэнты. У дадатку —метадычныя ўказанні па афармленню пісьмовых работ.

Сем выданняў адрасаваны студэнтам і выкладчыкам факультэтаў журналістыкі, работнікам газет і радыё, рабочым і сельскім карэспандэнтам.

У зборніку **«За газетным радком»** асвятляюцца некаторыя актуальныя праблемы публіцыстыкі, асобных газетных жанраў, засяроджваецца ўвага на асноўных пытаннях дзейнасці рэдакцый, абагульняецца станоўчы вопыт перыядычных выданняў рэспублікі. Зборнік склалі артыкулы Б. В. Стральцова «Замалёўка і нарыс у газеце», В. А. Хорсуна і І. Я. Хазанскага «Выхаванне патрыятызму», Г. Д. Куцэры «За эфектыўнасць перыядычнага друку» і іншыя.

Кніга Р. В. Булацкага і Э. А. Карніловіча **«Платон Галавач — публіцыст»** прысвечана публіцыстычнай і рэдактарскай дзейнасці вядомага беларускага пісьменніка. Аўтары падрабязна прасочваюць эвалюцыю творчасці Галавача, палітычныя і сацыяльна-гістарычныя ўмовы, у якіх фарміраваўся публіцыстычны талент пісьменніка, разглядаюць яго творы.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і роля друку ў прапагандзе яе дасягненняў, у вырашэнні праблем тэхнічнага прагрэсу—асноўны змест кнігі В. А. Пыжкова **«Журналіст у эканамічным пошуку»**. Яна пабудавана на матэрыяле цэнтральнага і мясцовага друку.

Даследаванне асаблівасцей развіцця інфармацыйных жанраў прэсы рэспублікі вядзецца ў кнізе Б. В. Стральцова **«Публіцыстычнасць інфармацыйных жанраў»**. Аўтар аналізуе дзейнасць працаўнікоў беларускага друку, раскрывае іх ролю ў развіцці інфармацыйных жанраў.

Кніга Р. В. Булацкага і С. В. Таланінай **«Вера Харужая — рэвалюцыянер, публіцыст»** расказвае аб жыцці і творчасці Героя Савецкага Саюза Веры Захараўны Харужай. Аўтары аналізуюць рэвалюцыйную і публіцыстычную дзейнасць слаўнай дачкі беларускага народа, раскрываюць яе творчую лабараторыю.

Галоўныя героі работы Е. Л. Бондаравай **«У кадры і за кадрам»** — артысты, аператары, рэжысёры і фільмы Беларусі. Як пачыналася кіно ў нашай рэспубліцы, аб яго сённяшнім дні, аб творчасці Ю. В. Тарыча, В. В. Корш-Сабліна, Л. В. Голуба і многіх іншых вы даведаецеся, прачытаўшы гэтую кнігу.

Дапаможнік А. В. Балаша **«Тэхніка афармлення газетнай паласы»** знаёміць чытачоў з пытаннямі афармлення і вытворчасці малафарматных газет, тэкставымі і тытульнымі шрыфтамі, з прыёмамі вёрсткі, з асновамі кампазіцыі паласы. У кнізе багаты даведачны матэрыял.

**«Лекцыі па матэматычнай логіцы»** (аўтар В. А. Машчэнскі) прадстаўляюць сабой элементарныя ўводзіны ў класічную матэматычную логіку. У дапаможніку разглядаюцца дасканалыя дыз'юнктыўныя, кан'юнктыўныя і імплікатыўныя нармальныя формы прапазіцыйных формул, пераўтварэнне дыз'юнктыўных і кан'юнктыўных нармальных форм ў адпаведныя дасканалыя, прымяненне булевых функцый і таўталогій у матэматычных доказах і тэорыі мностваў. Вывучаюцца прэдыкаты і аперацыі над імі.

Дапаможнік прызначан для студэнтаў малодшых курсаў спецыяльнасці «Прыкладная матэматыка».

Работа М. В. Мішурнай **«Аўтакод «Інжынер» для ЭЦВМ «Мінск-22М»** разлічана на студэнтаў фізіка-матэматычных і тэхнічных спецыяльнасцей вну. У ёй апісваецца ўваходная мова аўтакода «Інжынер» для ЭЦВМ «Мінск-22М». Прыведзена рэалізацыя прыёмаў праграміравання ў аўтакодавых праграмах. Прапанаваны задачы для праграміравання.

# ХУТКА НАВАСЕЛЛЕ

У Шчамысліцы, недалёка ад кальцавой дарогі, дзе спячыя пад снегам палі сустракаюцца з невялікім пералескам, вырас новы дванаццаціпавярховы універсітэцкі інтэрнат.

Хто будзе жыць у ім? Калі наваселле? Якія бытавыя ўмовы ствараюцца ў новым інтэрнаце? На гэтыя пытанні адказвае начальнік аддзела капітальнага будаўніцтва БДУ М. Н. Фрыдман.

— Ужо ў сакавіку гэтага года ключы ад пакояў атрымаюць студэнты, аспіранты, навуковыя супрацоўнікі універсітэта — усяго 1200 чалавек. Цяпер у будынку вядуцца аддзелачныя работы. Будучым жыхарам ствараецца максімум бытавых выгод.

Ва універсітэт наваселаў будзе дастаўляць дызельпоезд, які будзе курсіраваць пяць разоў на дзень. Можна будзе карыстацца і аўтобусам. К канцу года інтэрнат з гарадскім вакзалам звяжа электрычка.

**А. ЦЫГУЛЁЎ.**



**На здымку:** будынак новага універсітэцкага інтэрната.

Фота аўтара.

# КАЛІ Ў ІХ НЕСПАКОЙНЫЯ СЭРЦЫ

— Каб напісаць пра гэта, трэба ўсё ўбачыць сваімі вачыма, сэрцам адчуць прыгажосць турысцкага жыцця, — гаварылі мне рабяты.

На агульным сходзе членаў універсітэцкага турклуба, які адбыўся нядаўна, абмяркоўвалі план правядзення зімовых паходаў. Шчыра кажучы, спачатку я не разумела іх.

— Дзівакі, канікулы бываюць толькі раз у год, а яны правядуць іх дзесьці ў паходзе, з рукзаком за плячыма, на лыжах, у палатках.

Але затым я ўжо па-добраму зайздросціла ім, натхнёным рамантыкам, якія за вялікае шчасце лічаць дарогу. Неспакойныя сэрцы ў гэтых рабят.

Шумна і весела было ў аўдыторыі. Адно слова—турысты— растлумачвала ўсё. Яны з захапленнем гаварылі пра будучыя паходы, успаміналі мінулыя. А наперадзе сапраўды цудоўная перспектыва. Чатыры групы адпраўляюцца ў Карпаты, тры — у Карэлію, адна — у Хібіны, адна — па Ноўгарадскай вобласці, тры — па Беларусі. Ці мала хто з нас марыў пабываць у гэтых рэдкіх па прыгажосці мясцінах?

У паходах рабяты не толькі захапляюцца ўбачаным, але і праводзяць вялікую грамадскую работу: выступаюць у школах, сельскіх клубах з лекцыямі пра свой універсітэт, пра горад, у якім вучацца, арганізуюць спартыўныя спаборніцтвы, сустрэчы з цікавымі людзьмі. Падрабязную справаздачу аб гэтым яны прадстаўляюць затым у маршрутна - кваліфікацыйную камісію турклуба.

З мэтай папулярызацыі турызму на сходзе былі паказаны дыяпазітывы аднаго з выдатнейшых паходаў у Запаляр'е. Расказала аб ім удзельнік паходу, заўзяты турыст Ала Левіна.

Аднак у многіх выступленнях нельга было не адчуць горычы. Зменшылася колькасць членаў клуба і, як вынік, колькасць і складанасць маршрутаў. Чаму ж так адбылося? Ці не гаворыць гэта аб зніжэнні папулярнасці турызму сярод студэнтаў універсітэта?

Пастаянныя ўдзельнікі паходаў — фізікі, матэматыкі, географы, рэдка — журналісты. Але ж ва універсітэце столькі факультэтаў!

Магчыма, адна з прычын крыецца ў недастатковай інфармацыі студэнтаў аб дзейнасці турклуба. Вось і няхай рабяты, вярнуўшыся з паходаў, напішуць у газету аб сваіх уражаннях, аформяць цікавыя стэнды, альбомы. Безумоўна, гэта будзе вельмі карысна.

Цяпер жа, калі звыш ста чалавек рыхтуюцца ў паходы, хочацца шчыра пажадаць ім многа сонца і невялікага марозу. Шчаслівай вам дарогі!

**В. МІКУЛКА.**

# СТУДЭНЦКІЯ КАНІКУЛЫ...

## РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ПАДАРОЖЖА

Канчаецца сесія. Набліжаюцца студэнцкія канікулы. Наперадзе два тыдні, у час якіх трэба адпачыць і набрацца сіл для вучобы. Многія студэнты паедуць дадому, у родныя месцы. Іншых чакаюць турбазы, дамы адпачынку, турысцкія паязды.

— Што робіцца для арганізацыі цікавага і захапляючага адпачынку студэнтаў? — з гэтым пытаннем я звярнулася да намесніка старшыні прафкома БДУ Людмілы Міхайлаўны Маркоўскай.

**— У прафкоме ёсць 60 пуцёвак у міжвузаўскі санаторый-прафілакторый, 15 санаторна-курортных пуцёвак і 59— у дамы адпачынку, на турбазы.**

**Як і ў мінулым годзе, адправіцца ў падарожжа турпоезд «Карпаты». Студэнты прабудуць у дарозе 7 дзён, з 1 па 7 лютага. Харчаванне будзе арганізавана ў трох вагонах-рэстаранах. Разам з турыстамі выязджае універсітэцкі эстрадны ансамбль. Пуцёўка каштуе 32 рублі 50 кап.**

**Маршрут турпоезда — Мінск — Львоў — Ужгарад — Мукачава — Рахаў — Львоў — Мінск. Упершыню запрашае студэнтаў БДУ турпоезд «Ленінград», з 2 па 5 лютага. Ёсць 76 пуцёвак коштам 22 рублі 50 кап.**

**Тыя, хто жадае правесці частку канікул у Ленінградзе, павінны падаць заявы ў прафком.**

**У планах спортклуба — «Зорныя паходы».**

**В. СТАРАСЦІНА.**

ЛІСТОК ДАІ

# БЯСПЕКА РУХУ—СПРАВА КОЖНАГА

Мінулы год запомніўся, бадай, кожнаму з нас. Яго з поўным правам можна назваць годам працоўных перамог, выдатных дасягненняў. У нашым міліцэйскім календары гэты год таксама адзначан як асобы. У мінулым годзе наш горад удзельнічаў у трох вялікіх і важных мерапрыемствах — месячніках па папярэджанню дарожна-транспартных здарэнняў. На справе было даказана, што бяспека руху не з'яўляецца сугуба міліцэйскім пытаннем. У месячніках прынялі шырокі ўдзел калектывы прадпрыемстваў, навучальных устаноў, аўтагаспадарак і былі дасягнуты пэўныя поспехі ў справе бяспекі руху. І сёння мы можам канстатаваць: аварыйнасць на нашых вуліцах у мінулым годзе паменшылася.

640 дарожна - транспартных здарэнняў адбылося ў Мінску у мінулым годзе. Лічба гэта меншая, чым у папярэднія гады, але гэта яшчэ не можа заспакойваць: 640 няшчасцяў прыйшло ў чыесьці сем'і, 620 чалавек у выніку іх паранена, 56 загінула. Тут зразумела і гора блізкіх, і нараканні на хуткасць машын, і на міліцыю, што не змагла папярэдзіць няшчасце. А папярэдзіць жа няшчасце мог сам пацярпеўшы. Менавіта яму было лягчэй зрабіць гэта. Трэба было праявіць больш увагі і асцярожнасці, мацней верыць у законы дарогі і, канешне ж, не парушаць іх.

Усё гэта ў асноўным датычыць пешаходаў, хоць тут жа трэба адзначыць, што дысцыпліна пешаходаў у апошнія гады значна ўзрасла. Калі, скажам, у 1971 годзе па віне пешаходаў адбылося 68 працэнтаў усіх дарожных здарэнняў, то ў 1972 годзе іх было ўжо 55 працэнтаў, а ў 1973 годзе —40. Напэўна, ні для каго з мінчан не засталося незаўважаным, што значна ўзрасла культура пешаходнага руху на Ленінскім праспекце. І, як вынік, аварыйнасць на цэнтральнай транспартнай артэрыі Мінска знізілася на 17 працэнтаў.

На жаль, нельга добра адгукнуцца аб вадзіцелях. Па іх віне адбылося 400 дарожных няшчасцяў. Канешне ж, новыя правілы руху адыгралі тут вядомую ролю (не ўсе яшчэ прывыклі да іх), але аналіз дарожных здарэнняў гаворыць аб тым, што асноўная іх прычына — вадзіцельская недысцыплінаванасць. Патрабаванні дарожных знакаў, напрыклад, засвоіў кожны вадзіцель, але гэтыя патрабаванні часта парушаюцца. Парушаюцца таксама патрабаванні сігналаў светафора, а яны ж вядомы нават дзіцяці.

Трэба помніць усім удзельнікам руху: дробныя парушэнні дарожнай дысцыпліны нараджаюць вялікія няшчасці. Асноўная гарантыя вашай бяспекі на вуліцы — недапушчэнне гэтых парушэнняў.

**І. ХУДЗЕЕЎ,**
**начальнік ДАІ УУС Мінгарвыканкома.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 экз.
Газета выходзіць па чацвяргах.
Аб'ём—1 друк. ар.

Наш адрас: г. Мінск. Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 07036

Зак. № 105.